УДК 93/94 (323)

# МАНАРШЫЯ СПРАВЫ СТАНІСЛАВА АЎГУСТА ПАНЯТОЎСКАГА Ў 1795 – 1797 ГГ. ПАДЧАС ЗНАХОДЖАННЯ Ў ГРОДНА

***Наталля Васілюк***
*Гродна, Беларусь*

У артыкуле апісваецца і аналізуецца выкананне апошнім каралём польскім і вялікім князем літоўскім Станіславам Аўгустам Панятоўскім манаршых абавязкаў і дзяржаўных спраў перад адрачэннем ад прастолу.

***Ключавыя словы: кароль, Гродна, апошні сейм, манаршыя абавязкі, дзяржаўныя справы***

Пасля апошняга сейма Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, кароль польскі і вялікі князь літоўскі, прабыў у Гродна з 1795 па 1797 г., чакаючы адрачэння ад прастолу, якое было відавочна кожнаму, у тым ліку і яму самому. Ці выконваў апошні кароль свае манаршыя абавязкі, ці займаўся дзяржаўнымі справамі ў такія цяжкія часы? Калі так, то як часта і як адказна? У артыкуле пастараемся даць адказ на гэтае пытанне.

У 1795 – 1797 гг. Станіслаў Аўгуст жыў у Гродна, актыўна займаючыся дзяржаўнымі справамі. М. Ф. Дэ-Пуле, расійскі гісторык XIX ст., пісаў: “Освоившись со своим новым положением, успокоившись, король вошел в свой обыкновенный, повседневный образ жизни. От дворцовской жизни он никак не хотел отказаться: выходы, приемы, официальные приемы запросто, обеды и ужины, простые и парадные, продолжались по-прежнему, при той же королевской обстановке, как и в Варшаве” [2, с.49].

Як сапраўдны кароль, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі сапраўды часта бываў на балях у высокапастаўленых асоб. І. А. Безбародка, асабісты прыстаў караля, які штодзённа пісаў аб жыцці Станіслава Аўгуста, распавядае: “Вечером 9 мая 1795 г. Его Величество приехал к Главнокомандующему, где нашёл большую публику, по случаю бала, и, пробыв с час, уехал к себе. 16 апреля король был в доме, принадлежащем господину Стреинскому, разговаривал со многими, подходил к дамам разговаривал с ними. 5 января к столу представил главнокомандующий князя Голицына, который приглашен был к столу и обедал с его величеством и главнокомандующим” [3, с. 32].

Кароль нараду з “парадным” каралеўскім жыццём не спыняўся займацца і манаршымі абавязкамі, але рабіць гэта з кожным днём было ўсё цяжэй і цяжэй у сувязі з кантролем, усталяваным за каралеўскімі паводзінамі. Станіслаў Аўгуст жыў у Новым Замку на другім паверсе, які строга ахоўвалі расійскія жаўнеры. Дзяжурны афіцэр кожны дзень займаўся складаннем рапартаў для князя Цыцыянава – начальніка гродзенскага гарнізона. Любыя сходы былі забаронены, каралеўская перапіска знаходзілася пад кантролем. Нават у начную пару ў суседнім пакоі знаходзіліся каралеўскія шамбеляны [1, с. 28].

С. А. Панятоўскі актыўна кантактаваў з галоўнакамандуючым М. В. Рапніным. Дзве высокапастаўленыя асобы часта сустракаліся дзеля таго, каб абгаварыць дзяржаўныя справы. Па словах Безбародкі, “13 мая 1795 г. главнокомандующий, прибыв во втором часу, обедал у короля. 16 мая приьыл главнокомандующий, кушал у короля, и в четыре часа уехал. 1 июля представлен был Главнокомандующим к королю полклвник и кавалер Сакен” [3, с. 32].

Можна заўважыць узаемную павагу караля і галоўнакамандуючага, бо “ 9 мая король посылал Шамбеляна поздравить Главнокомандующего с тезоименнитством его. После обеда ездил король и Главнокомандующий прогуливаться в Понёмунь” [3, с. 32].

Амаль кожны дзень Станіслаў Аўгуст Панятоўскі прымаў у сябе знатных асоб, з якімі агаворваў будучае ўжо амаль разваленай дзяржавы. Яшчэ ў дзень прыбыцця

Панятоўскага ў Гродна 1 студзеня 1795 г. яго суправаджалі польскі генерал Гаржынскі, абат Валовіч, эканом Рыкс, граф Трамбіцкі і інш. [2, с. 45].

М. Дэ-Пуле піша, што Панятоўскага ў Гродна акружала значная частка польскай знаці – рэспубліканцы, ворагі рэформ, людзі старых парадкаў. Сярод іх – нярэдкія госці Новага замка падскарбій Дзяконскі, генерал Шыдлоўскі, князь Чартарыйскі і інш. [2, с. 29].

Таксама часта завітваў да Станіслава Аўгуста галоўнакамандуючы М. В. Рапнін, да якога кароль меў шмат спраў. І. А. Безбародка, асабісты прыстаў Панятоўскага, які кожны дзень пісаў аб яго жыцці, заўважаў: “6 августа шамбелян Вольский ездил от Короля к главнокомандующему. 1 января к вечеру приезжал от главнокомандующего генерал-майор Тормасов спросить Его Величество о назначении времени, когда представить ему находящийся здесь Генералитет” [3, с. 37].

Панятоўскі меў сувязь не толькі з высокапастаўленымі асобамі, але і з народам. Граф Безбародка падкрэсліваў: “11 декабря в 10 часов по утру приходил к Королю и подал просьбу Шляхтич Рожановский з местечка Кузниц” [3, с. 52].

Апошняму каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму падабалася займацца чытаннем і пісьмом. Часам ён рабіў гэта не таму, што трэба, а таму, што гэтая справа дастаўляла яму задавальненне. Па словах Безбародкі, “24 июля Его Величество весь день провёл в чтении книг. 6 августа Его Величество после обеда, по обыкновению, упражнялся в чтении и письме до 6 часов” [3, с. 43]. Часта Станіслава можна было застаць за чытаннем газет – манарх і сапраўды цікавіўся падзеямі, якія адбываліся пакуль яшчэ ў яго краіне: “13 августа Его Величество, возвратясь пред обедом с прогулки, во весь день занимался Английскими газетами. 21 августа после обеда до 4 часов сидел в зале, занимаясь чтением газет” [3, с. 46].

Панятоўскі вёў абшырную перапіску як дзелавую, так і з роднымі людзьмі. Яго асабісты прыстаў заўважаў: “3 декабря Его Величество провёл весь день в чтении и писании. 25 марта из Варшавы приехал королевский секретарь и привёз письма к королю. 10 июля прибыла во дворец в Гродно из Варшавы Госпожа Люлли и остановилась во дворце. Тотчас пошла прямо в кабинет Его Величества и подала от всех его родных письма, где пробыв с час, пошла в отведённые ей покои. Его Величество весь день занимался привезёнными письмами. 22 августа Его Величество после обеда занимался отправлением писем в Варшаву” [3, с. 72].

25 лістапада 1795 г. кароль быў выкліканы ў былы палац Тызенгаўза, які ўжо стаў палацам Вярхоўнага літоўскага правіцеля, расійскага генерал-губернатара Эстляндскага, Віленскага і Курляндскага Мікалая Рэпніна і атрымаў у рукі ліст, які павінен быў падпісаць – ліст адрачэння ад прастолу.

Пасля яго падпісання Панятоўскі вёў ажыўленую перапіску з Варшавай: “5 сентября Его Величество после обеда занимался отправлением писем в Варшаву со старостою Рыксом, которой сего ж дня отправился туда с тремя при нём человеками по подорожной за подписанием Главнокомандующего” [3, с. 88]. Прыбыўная з Варшавы ў Гродна мадэмуазель Люлі, каханка Панятоўскага, адразу накіравалася ў яго кабінет і прынесла цэлы стос пісем.

Але не прыемным быў той факт, што “финансовая беспорядочность короля с каждым месяцем увеличивалась даже в Гродно, где он жил на русские деньги” [2, с. 82]. Фрыз, асабісты сакратар караля, заўважаў, што Панятоўскі быў сярод тых людзей, якія яго аб’ядалі і абіралі.

Дэ-Пуле пісаў: “Почти половина излучаемого им от русского правительства содержания уходила на варшавские пенсионы; между лицами, получающими последние, было множество дармоедов, так что на долю престарелых слуг, нуждающихся в помощи, доставалась ничтожная сумма, недостаточная для удовлетворения первоначальных потребностей” [2, с. 102].

Па гэтым прычынам пад час ад’езду Панятоўскага з Гродна ў Пецярбург у 1797 г. ён не ведаў, чым яму расплаціцца з вялікай колькасцю даўгоў, якія раслі з кожным днём. Па словах Дэ-Пуле, “Станислав Август не знал, как добраться до Петербурга со своим

ПолесГУ

двором и на какие средства прокормить его до тех пор, пока снова будут выдавать месячное жалованье” [2, с. 110].

Але ўсё-такі Панятоўскі быў добрым палітыкам. Ён разумеў, што рана ці позна вымушаны будзе адрачыся ад прастола, таму не бачыў сэнсу эканоміць грошы расійскай казны. Мала таго, што ён ні ў чым сабе не адказваў, дык яшчэ раздаваў грошы і маёнткі добрым знаёмым. З мемуараў Яна Ахоцкага, польскага шляхціча XVIII ст.: “У канцы гэтага года з’явілася маркіза Люлі, французская эмігрантка. Яна, зразумела, не любіла караля, але любіла толькі каралеўскія багацця; акрамя вялізных сум, якіх каштавала яе жыццё, экіпажы, брыльянты, яшчэ шмат мільёнаў, тры казалі, было пакладзена ёю ў замежныя банкі” [4, с. 99].

Пытанне аб даўгах былога караля польскага і вялікага князя літоўскага было вырашана канвенцыяй ад 15 студзеня 1797 г. паміж трыма дзяржавамі – удзельніцамі падзелаў.

Такім чынам, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі быў сапраўды адукаваным чалавекам, які нават у апошния дні кіравання дзяржавай не адносіўся да яе абыякава, а значны адрэзак свайго часу праводзіў за манаршымі справамі: чытаннем кніг і газет, пісаннем і адпраўленнем пісьмаў, сустрэчамі са знатнымі асобамі, якія займалі высокія дзяржаўныя пасады. Гэта не можа характарызаваць яго як караля і як чалавека з негатыўнага боку.


1. Гродна – 875: Матэрыялы абласной канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў, 25 лістапада 2003 г. / Пад рэд. С.В.Марозавай, І.П.Крэня, С.У.Амелькі. – Гродна: ГрДУ, 2004. – 64 с. С.27
2. Де-Пуле, М. Ф. Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794–1797 годах / М. Ф. Де-Пуле. – СПб. : Тип. Майкова, 1871. – 255 с.
3. Журнал пребывания Его Величества Короля Польского, Станислава Августа в Гродно 1795 – 1796 гг. // Чтения в Императорском обществе истории и древностей Российских, при Московском университете. Июль-сентябрь. Кн.3., Москва, 1870. С. 1 – 157.
4. Крашевский Ю.А. Рассказы о польской старине. Записки 18 века Яна Дуклана Охотского / Ю.А. Крашевский. – М: Тип. П.П.Меркульева, 1874. – 298 с.


ПолесГУ